аднаўленні роднага горада 31 тысячу 825 чалавека-дзён.

Праз два тыдні пасля вызвалення Мазыра пачаліся заняткі ў чатырох пачатковых і дзвюх сямігадовых школах. Пачаў працаваць дзіцячы дом, у якім выхоўвалі 150 сірот. Адноўлена было педагагічнае вучылішча. А ў лютым 1944 г. урад Беларусі прыняў пастанову аб адкрыцці ў Мазыры настаўніцкага інстытута. У пачатку красавіка там пачаліся заняткі.

Аднаўляючы разбураную ворагам народную гаспадарку, працоўныя Мазыра і раёна да канца вайны аказвалі рознабаковую дапамогу фронту. Яны ўнеслі свой уклад у справу дасягнення канчатковай перамогі над гітлераўскай Германіяй. Пасля перамогі ўся ўвага і намаганні насельніцтва былі накіраваны на аднаўленне і далейшае развіццё народнай гаспадаркі. І яно ішло хуткімі тэмпамі.

*А. Васько*

## Савецкая ўлада вяртаецца

Увесь студзень 1944 года ішлі ўпартыя баі за вызваленне Мазыршчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Да канца чэрвеня Асавецкі і Скрыгалаўскі сельскія Саветы знаходзіліся на лініі фронту, якая праходзіла за 35—40 кіламетраў ад Мазыра па рацэ Прыпяць. Гэта перашкаджала аднаўленню народнай гаспадаркі пастаяннымі налётамі варожай авіяцыі, высокай канцэнтраванасцю войск у прыфрантавой паласе. Амаль тры тысячы мужчын, якія ў ваенныя гады жылі ў вёсках, разам з часткаю партызан брыгады імя Аляксандра Неўскага былі мабілізаваны ў Чырвоную Армію.

З ліку моладзі дапрызыўнага ўзросту і былых воінаў, дэмабілізаваных па раненні, ваенкаматамі і арганізацыямі ДТСААФ былі сфарміраваны ваенізаваныя атрады па размініраванні вызваленай тэрыторыі раёна і брыгады па будаўніцтве прымітыўных грамадскіх пабудоў і жылля для сем'яў загінуўшых на фронце.

На працягу студзеня 1944 года ў Мазыры і ў Мазырскім раёне распачалі дзейнасць усе Саветы, ад абласнога да сельскіх, а да вясны ва ўсіх населеных пунктах былі адноўлены калгасы, сістэма сувязі, установы народнай асветы, гандлю і іншыя службы.

Аб актыўнай, напружанай рабоце органаў Савецкай улады на вызваленай ад ворага Мазыршчыне сведчаць архіўныя дакументы, што прыводзяцца ніжэй.

### ПАСТАНОВА ПАЛЕСКАГА АБЛСАВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

г. Мазыр *21 студзеня 1944 г.*

Об открытии питательных пунктов для возвратившихся граждан из тыла противника.

Исполком областного Совета депутатов трудящихся постановляет:

1. Открыть два питательных пункта: первый — питательный пункт при Калинковичском горторге; второй — при горторге г. Мозыря для питания граждан, возвратившихся из тыла противника. Отпустить по одной тонне зерна, по центнеру крупы и по одной тонне картофеля для общего питания.

2. Норму хлеба установить по 200 грамм на одного человека на обед и ужин.

...5. Отпуск обедов и ужинов производить по списку, проверяя документы.

Председатель исполкома облсовета *В. Леденев*

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 172. Воп. 2. Спр. 1. Л. 1.*

## № 1
## АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА МАЗЫРСКАГА ГАРАДСКОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

*28 студзеня 1944 г.*

Все руководители учреждений и владельцы домов к 28 января 1944 г. обязаны: очистить от мусора находящиеся в их ведении дворы и прилежащие тротуары.

Впредь содержать их в надлежащей чистоте. Для очистки площадей и прочих мест мобилизовать все трудоспособное население гор. Мозыря сроком три дня. Обязать нач. гор. милиции обеспечить выполнение настоящего постановления, впредь взять под контроль милиции соблюдение чистоты в городе.

Председатель исполкома Мозырского
городского Совета депутатов трудящихся *Король*

Секретарь исполкома Мозырского
городского Совета депутатов трудящихся *Красюк*

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 112. Воп. 3. Спр. 9. Л. 24.*

## РАШЭННЕ № 1
## ВЫКАНКАМА МАЗЫРСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

На першым пасяджэнні выканаўчага камітэта Мазырскага раённага Савета дэпутатаў працоўных 9 лютага 1944 года былі прызначаны на адказныя пасады аднаўленых органаў Савецкай улады ў раене:

загадчыкам зямельнага аддзела — Ганчар Аляксандр Сямёнавіч
загадчыкам аддзела адукацыі — Бабовіч Аляксандр Данілавіч
загадчыкам аддзела аховы здароўя — Ржавуцкая Алена Баляславаўна
загадчыкам аддзела сацыяльнага забеспячэння — Лузан Пётр Макаравіч
загадчыкам аддзела гандлю — Пальчэўскі Васіль Ігнатавіч
загадчыкам фінансавага аддзела — Рэвут Іван Васілевіч
загадчыкам дарожнага аддзела — Гаруля Аляксандр Сямёнавіч
загадчыкам агульнага аддзела выканкама — Раеўскі Іван Паўлавіч
раённым інспектарам ЦСУ — Прус Аляксей Мікалаевіч
народным суддзёй раёна — Кадзякоў Мікалай Васілевіч.

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 59. Воп. 2. Спр. 1.*

## РАШЭННЕ № 18
## ВЫКАНКАМА МАЗЫРСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

*22 лютага 1944 г.*

Об открытии детского дома в Мозырском районе.

Исполком Мозырского районного Совета депутатов трудящихся решил:

1. Открыть районный дом для детей-сирот в деревне Слобода Слободского сельсовета.
2. Обязать председателя Слободского сельсовета тов. Пешко А. Е. и председателей колхозов обеспечить подбор помещений для детского дома.

Выделить необходимое количество рабочих для ремонта и подготовки детского дома. Назначить срок открытия дома к 5 марта 1944 года.

3. Предложить председателю Скрыгаловского сельсовета обеспечить детдом топливом и тягловой силой.
4. Обязать районо подобрать работников и воспитателей детского дома.

Председатель Мозырского райисполкома *Жильский*
Секретарь Мозырского райисполкома *Пивоваров*

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 59. Воп. 2. Спр. 1. Л. 21.*

## РАШЭННЕ
## МАЗЫРСКАГА ГАРАДСКОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

*19 красавіка 1944 г.*

О восстановлении жилфонда и коммунальных предприятий г. Мозыря.

Ход восстановления жилфонда Мозыря и предприятий городского коммунального хозяйства за последнее время из-за отсутствия рабочей силы проводится крайне неудовлетворительно, коммунальные предприятия пускаются в эксплуатацию с большими опозданиями, с рядом недоделок... Городское хозяйство находится в исключительно запущенном состоянии...

Мозырский городской исполнительный комитет депутатов трудящихся решил:

...Просить облисполком для восстановления областного города мобилизовать с области следующее количество рабочих специальностей: плотников — 120, столяров — 40, печников — 25, штукатуров — 30, разнорабочих — 100...

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 112. Воп. 3. Спр. 6. Л. 40.*

## З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ МАЗЫРСКАГА ГАРВЫКАНКАМА

*11 мая 1944 г.*

...До войны в гор. Мозыре было 11 школ, из них 4 средние, 6 неполных средних и 1 начальная школа. Они охватывали обучением 3340 учащихся. За время войны все школьное имущество растащено и разграблено, а сами школьные здания приведены в негодное состояние, за исключением двух. 9 зданий требуют ремонта. В настоящее время под школы приспособлено 6 зданий. 4-я бывшая и 7-я школы требуют капитального ремонта.

Детсад и школа на Пхове требуют текущего ремонта. Всего в 1944/1945 учебном году должно работать 8 школ: из них 3 средние, 3 неполные средние и 2 начальные. Всего они должны охватить обучением 2500 учащихся.

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 172. Воп. 2. Спр. 3. Л. 111.*

## З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ МАЗЫРСКАГА ГАРВЫКАНКАМА

*13 чэрвеня 1944 г.*

...1943/1944 учебный год в Мозыре начался в феврале 1944 года после освобождения от немецко-фашистских захватчиков. В самый короткий срок были восстановлены первые школы. Особо проявил себя учительский коллектив СШ № 1 и 2-й неполной средней школы. В настоящее время в городе работает 6 школ, в них обучается 954 учащихся. Повторили и усвоили программу 778 учащихся, 88 получили работу на лето и 89 оставлены на повторный год...

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 172. Воп. 2. Спр. 3. Л. 138.*

## РАШЭННЕ № 380
## ВЫКАНКАМА МАЗЫРСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

*29 кастрычніка 1944 г.*

О бытовом устройстве инвалидов Отечественной войны.

Несмотря на приближение зимы в ряде мест председатели сельсоветов и колхозов, райсобес не проявили должной заботы о материальном и бытовом устройстве инвалидов Отечественной войны и их семей. Не оказывают должной помощи в строительстве жилья инвалидам и погорельцам в Скрыгаловском, Слободском и Михалковском сельсоветах, где еще 18 семей инвалидов войны не имеют домов или приспособленных к зимовке землянок.

Многие инвалиды испытывают большие трудности в обеспечении одеждой, обувью и продовольствием.

Исполком районного Совета решил:

1. Потребовать от председателей сельсоветов и колхозов создать специальные бригады для строительства домов и приспособленных землянок, в которых было бы возможно зимовать инвалидам войны и их семьям.

2. Предложить председателям сельсоветов и отделу социального обеспечения немедленно организовать воскресники по оказанию помощи инвалидам Отечественной войны в строительстве домов, землянок, заготовке дров и т. д.

3. Предложить заведующему райторготделом тов. Амельковичу произвести заказ на пошив необходимого количества обуви и одежды для инвалидов Отечественной войны, крайне нуждающихся в этом, а также выделять 15 % всех товаров рыночного фонда, прибывающих райпотребсоюзу.

4. Обязать заведующего отделом соцобеспечения тов. Радкевича о выполнении данного решения информировать исполком райсовета к 10 ноября 1944 года.

Председатель исполкома райсовета *Жильский*
Секретарь исполкома райсовета *Пивоваров*

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 59. Воп. 2. Спр. 2. Л. 192.*

# Баявая слава Мазыршчыны

## Героі Савецкага Саюза

**Барысаў Міхаіл Уладзіміравіч** (н. 16.4.1923 г. у в.募раўшчызна) — Герой Савецкага Саюза (1945). Скончыў Гомельскі аэраклуб, ваенна-марское авіяцыйнае вучылішча. З жніўня 1944 г. лейтэнант Барысаў ваяваў на Балтыйскім флоце, быў камандзірам звяна, намеснікам камандзіра эскадрыллі 8-й мінна-тарпеднай авіядывізіі.

За 10 месяцаў 1944—1945 гг. М. У. Барысаў зрабіў 47 баявых вылетаў, патапіў 9 і пашкодзіў 2 транспарты праціўніка водазмяшчэннем 80 тыс. тон. Умелай атакай патапіў нямецкі лінкор «Шлезвіг-Гальштэйн».

Да 1960 г. падпалкоўнік М. У. Барысаў служыў у Савецкай Арміі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, многімі медалямі.

Дзіўныя лёсы бываюць і ў людзей, знешне непрыкметных, і ў населеных пунктаў. Невялікая вёска Нараўшчызна — усяго два дзесяткі хат было да вайны — стала радзімай двух Герояў Савецкага Саюза: М. У. Барысава і М. В. Мураўёва.

Міхаіла Барысава старажылы памятаюць яшчэ хлапчуком. Яніна Шчапаноўская паказала месца, дзе калісьці стаяла хата Барысавых.

— Добрыя былі людзі, — гаворыць Яніна Людвігаўна, — бацька, вясковы фельчар, дапамагаў сялянам, лячыў і словам і справай. І дзеці пайшлі ў бацьку. Міша добра вучыўся. Стаў лётчыкам, і не проста лётчыкам — Героем. Некалькі разоў прыязджаў у Нараўшчызну пасля вайны. Хата іх у Мазыры згарэла ў вайну. І вось ён, Герой, у званні маёра, з сякерай завіхаўся каля новай будыніны. Не паехаў, пакуль не закончылі зруб. Не любіў расказваць пра свае баявыя подзвігі, пра іх у нас хадзілі легенды...

**Катлавец Міхаіл Паўлавіч** (н. 25.10.1914 г. у в. Лешня) — Герой Савецкага Саюза, камандзір танкавага батальёна. Да вайны скончыў Мінскі педінстытут і быў адразу прызваны ў Чырвоную Армію. Пачынаў вайну камандзірам танка, а ў чэрвені 1942 г. ужо камандаваў танкавым батальёнам. Асабліва вызначыўся ў баях восенню 1944 г. у Малдавіі. Узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага, баявымі медалямі. Загінуў 6.10.1944 г.

Ужо тры гады капітан Катлавец на фронце, а здаецца, што ваяваў усё жыццё. Танк даўно стаў нібы родным домам... Цяжкія баі вёў танкавы корпус у студзені 1944 г. у раёне Кіраваграда. Вораг бесперапынна контратакаваў, у баі за станцыю Лялекаўка экіпаж танка Катлаўца знішчыў сем танкаў, у адзін з самых напружаных дзён адбіў шэсць контратак. У наступных баях батальён, якім камандаваў капітан Катлавец, імклівым ударам завалодаў плацдармам на правым беразе р. Днестр і ўтрымліваў яго да прыходу асноўных сіл. Не адзін дзесятак танкаў, гармат САУ і ін-